*УДК 808.26 - 3 (043.3)*

# Лексіка-семантычная характарыстыка будаўнічых тэрмінаў- словазлучэнняў

Пятрова Н.Я.
Беларускі нацыянальны тэхнічыны ўніверсітэт

Беларуская тэрміналогія ў галіне будаўніцтва прадстаўлена разнастайнымі па структуры лексічнымі адзінкамі. Пашыранымі адзінкамі з'яўляюцца тэрміны-словазлучэнні, сярод якіх пераважаюць двухкампанентныя спалучэнні са значэннем назвы матэрыялаў.

Тэрміны-словазлучэнні набылі шырокае распаўсюджванне ў беларускай мове яшчэ ў пачатку ХХ ст. У слоўніку "Тэхнічнай тэрміналёгіі" прадстаўлена вялікая колькасць прыкладаў: *агняўпорная цэгла* (с. 351)*, *бэтонны слой* (с. 268), *графітнае мазіва* (с. 292), *жалезны каркас* (с. 301), *шапотная цэгла* (с. 417) і інш. У сучаснай будаўнічай тэрміналогіі пераважаюць наступныя лексіка-семантычныя групы:

1. **Назвы адзінак вымярэння, велічынь**: *дапушчальнае адхіленне, каэфіцыент гукапаглынання, марка бетону паводле шчыльнасці* і інш.
2. **Назвы матэрыялаў**: *дахавы дыван, дрот стальны, фарбавальнікі нераствааральныя, цэгла будаўнічая, шпалеры вінілавыя* і інш.
3. **Назвы інструментаў, прыбораў і прыстасаванняў**: *агрэгат помпавы, кораб вентыляцыйны, нерухомыя апоры, разьбарэз слясарны, стол для рэзкі цэглы, стол свідравальны, эталонны малаток* і інш.
4. **Назвы прасторавых паняццяў**: *кадастравы квартал, месца населенае, населены пункт* і інш.
5. **Назвы ёмістасцей**: *бак вадамерны, кантэйнер будаўнічы, катлы ацяпляльныя, кацёл паравы, тара драўляная* і інш.
6. **Назвы машын і іх частак**: *гідраўлічны дамкрат, дарожна-будаўнічыя машыны, землярыйная машына, коўш экскаватара* і інш.
7. **Назвы прафесій і сфер дзейнасці**: *апалубачныя работы, геадэзічныя разбівачныя работы, пачасавы рабочы* і інш.
8. **Назвы спецыяльных прадметаў**: *змеявік награвальны, рыштаванні верхнія, цвік гонтавы, цвік рэечны, цвік шыферны* і інш.
9. **Назвы будынкаў, памяшканняў, іх частак, будаўнічых канструкцый**: *аб'ект будаўніцтва, будынак аднапавярховы, дах мансардавы, кружала аркі, лесвічная пляцоўка, шафа батарэйная* і інш.
10. **Назвы дзеянняў**: *кладка дахавага крыцця, лакіраванне з распыленнем, мураванне сухое, нанясенне асфальтавага пакрыцця* і інш.

---

*Прыклады падаюцца з указанне нумара старонкі паводле выдання: Беларуская навуковая тэрміналогія: у 4 кн. – Мн.: ARCHE, 2010. – Кн. 4.